## 164-я сесія Выканаўчага савета ЮНЕСКА

**13 — 31 мая 2002 г.** у Парыжы адбылася 164-я сесія Выканаўчага савета ЮНЕСКА, у якіх брала ўдзел беларуская дэлегацыя на чале са старшынёй Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Паслом па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь У.Р.Шчасным.

Прадстаўнікі дзяржаў-членаў Савета ў ходзе пленарных пасяджэнняў абмеркавалі шырокае кола пытанняў, звязаных з міжнародным супрацоўніцтвам у сферы адукацыі, навукі, культуры. Былі заслуханы даклад аб ажыццяўленні Дакарскіх рамак дзеянняў у галіне адукацыі, прапановы ў сувязі з правядзеннем Міжнароднага года прэснай вады, і захадах ЮНЕСКА ў галіне біяэтыкі, аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Беларуская дэлегацыя правяла шэраг сустрэч з кіраўніцтвам Сакратарыята ЮНЕСКА, у ходзе якіх былі абмеркаваны канкрэтныя напрамкі ўзаемадзеяння нашай краіны з гэтай арганізацыяй. У прыватнасці, разгледжаны праекты па зберажэнні і выкарыстанні культурнай спадчыны і ўстойліваму развіццю ў Па-

лескім рэгіёне, супрацоўніцтве ў сферы адукацыі. 28 мая У.Р.Шчасны сустрэўся з Генеральным дырэктарам ЮНЕСКА К.Мацуурай, выказаў яму задаволенасць ўзроўнем падрыхтоўкі вынесеных на разгляд сесіі матэрыялаў, канструктыўным характарам дыскусій, у чым бачыцца значная заслуга Сакратарыята ЮНЕСКА. Генеральнаму дырэктару быў перададзены ліст ад імя Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь М.М.Хвастова з прапановамі ў рамках падрыхтоўкі візіту К.Мацууры, якія запланаваны на 8—10 ліпеня 2002 г. Падчас сустрэчы была дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы праекта мемарандума аб супрацоўніцтве Урада Беларусі з ЮНЕСКА для падпісання ў ходзе візіту. У.Р.Шчасны падкрэсліў, што для нашай краіны вельмі важнай з'яўляецца падтрымка з боку ЮНЕСКА ў галіне адукацыі, навукі, культуры і камунікацый. Генеральны дырэктар быў інфармаваны аб маючым адбыцца адкрыцці ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі Цэнтра інфармацыі і дакументацыі ЮНЕСКА, аб іншых напрамках і канкрэтных праектах двухбаковага супрацоўніцтва.